**25.** Усім вядомыя радкі песні:

*Бывайце здаровы,*
*Жывіце багата…*

Хто з’яўляецца аўтарам слоў?

**А)** Пятрусь Броўка. **Б)** Алесь Ставер. **В)** Адам Русак.
**Г)** Алесь Звонак. **Д)** Уладзімір Дубоўка.

---

**26.** Каго з беларускіх княгінь называюць “беларускай Джульетай”?

**А)** Анастасію Слуцкую. **Б)** Рагнеду. **В)** Саламею Рэгіну Русецкую.
**Г)** Прадславу. **Д)** Барбару Радзівіл.

---

**27.** У свой час Кірыла Тураўскі пра адно з найвялікшых хрысціянскіх святаў пісаў: “Сёння сонца, красуючыся, узыходзіць на вышыні нябёсаў і з радасцю зямлю грэе… Сёння старое канчаецца і чыніцца ўсё новае дзеля ўваскрашэння…” Пра якое свята ўзгадваецца?

**А)** пра Вялікдзень. **Б)** пра Мядовы Спас. **В)** пра Каляды.
**Г)** пра Купалле. **Д)** пра Узвіжанне.

---

**28.** Дадзены прозвішчы вядомых беларускіх дзеячаў:

*1) Віктар Карамазаў; 2) Анатоль Багатыроў;*
*3) Пётр Клімук; 4) Георгій Паплаўскі.*

Суаднясіце прозвішчы асоб з родам іх дзейнасці:

*а) касманаўт; б) мастак; в) пісьменнік; г) кампазітар.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Д)** 1-б, 2-в, 3-а, 4-г.

---

**29.** Бытуе легенда, што на адным з каменняў у фальварку Завоссе Адам Міцкевіч выбіў крыж у гонар свайго безадказнага кахання да …, які і зараз ляжыць ля хутара. Якое імя прапушчана?

**А)** Марылі Верашчакі. **Б)** Ганны Кукуевай. **В)** Паўліны Мядзёлкі.
**Г)** Магдалены Радзівіл. **Д)** Алесі Карыткінай.

---

**30.** Асветніцтва, пачатае Францыскам Скарынам, мела працяг. У Куцінскай друкарні пры манастыры пад Оршай у 1631 годзе з’явілася кніга пад назвай “Буквар” (“Букварь сиречь начало учения детям, начинающим чтению извыкати”). Хто з дзеячаў таго часу стварыў гэты “Буквар” (да яго падручнікі называліся “Азбука”)?

**А)** Сільвестр Косаў. **Б)** Фларыян Грабніцкі. **В)** Іван Грыгаровіч.
**Г)** Аляксандр Семянтоўскі. **Д)** Спірыдон Собаль.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 12300 экз. г. Мінск. 2019 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2019»

*Чацвер, 21 лютага 2019 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Якога слова не хапае ў афарызме?

*Апетыт прыходзіць у час … .*

**А)** работы. **Б)** урока. **В)** адпачынку. **Г)** прабежкі. **Д)** яды.

---

**2.** Закончыце народнае выслоўе:

*Яна загаворыць, як у званок зазвоніць, яна заспявае, як на … зайграе.*

**А)** балалайцы. **Б)** гітары. **В)** цымбалах. **Г)** скрыпцы. **Д)** дудцы.

---

**3.** Гэта міфалагічная істота звязвалася ў народзе не з вадой, а з агнём. Яна з’ўлялася на палях апоўдні, звычайна летам, і пільна сачыла, каб апоўдні ніхто не працаваў і не купаўся. Таго з людзей, хто прадаўжаў працаваць ці купаўся, карала сонечным ударам. Хто гэта?

**А)** русалка. **Б)** палудніца. **В)** багінка. **Г)** ласкатуха. **Д)** самадзіва.

---

**4.** Адным з першых псеўданімаў Якуба Коласа быў псеўданім … .

**А)** Тарас Гушча. **Б)** Ядвігін Ш. **В)** Тарас Бульба.
**Г)** Андрэй Мрый. **Д)** Максім Танк.

---

**5.** Гэты горад – адзін са старажытнейшых гарадоў Беларусі. Яго часта называюць другім Іерусалімам. Што гэта за горад?

**А)** Тураў. **Б)** Мсціслаў. **В)** Віцебск. **Г)** Гродна. **Д)** Полацк.

**6.** Які з дадзеных назоўнікаў мае пераноснае значэнне *‘назва якой-небудзь галіны дзейнасці, дзе хто-небудзь адчувае сябе поўнаўладным гаспадаром’*?

*1) вотчына; 2) кавалак; 3) прыбытак; 4) замчышча; 5) існасць.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**7.** Хто з’яўляецца аўтарам балад “Свіцязь”, “Свіцязянка”?

**А)** В. Дунін-Марцінкевіч. **Б)** Максім Танк. **В)** Адам Міцкевіч.
**Г)** Янка Купала. **Д)** Максім Багдановіч.

---

**8.** Копія друкарскага набору, нанесеная на металічную, гумавую або пластмасавую пласцінку – … .

**А)** стэрэатып. **Б)** стырэатып. **В)** стэрыатып. **Г)** стэрэятып. **Д)** стэарэтып.

---

**9.** Выберыце правільна напісанае словазлучэнне.

**А)** камп’ютарныя гульні. **Б)** кампьютарныя гульні.
**В)** камп’ютэрныя гульні. **Г)** камп’ютарные гульні. **Д)** кампутэрныя гульні.

---

**10.** Усім вядомы радкі песні:

*Патухаюць, цямнеюць высі.*
*Зоркі ўспыхваюць над сінявой.*
*Да пляча майго прыхініся*
*Залатою сваёй галавой…*

Хто з беларускіх паэтаў з’яўляецца аўтарам слоў?

**А)** А. Вялюгін. **Б)** Р. Барадулін. **В)** Г. Бураўкін.
**Г)** В. Зуёнак. **Д)** А. Пысін.

---

**11.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя прыклады:

*1) аўтамабіль Масквіч; 2) Дзень ведаў; 3) залаты век; 4) кубак свету.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**12.** Выберыце з дадзеных прыкладаў устойлівае спалучэнне.

*1) размарын-трава; 2) сон-трава; 3) трын-трава.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**13.** *Кароткае аднаэпізоднае вуснае апавяданне пра розныя жыццёвыя сітуацыі з нечаканай дасціпнай камічнай развязкай, якая звычайна выклікае раптоўны смех,* называецца … .

**А)** анекдот. **Б)** анікдот. **В)** анехдот. **Г)** аніхдот. **Д)** энекдот.

---

**14.** Колькі асабовых займеннікаў ужыта ў вершаваных радках А. Вярцінскага?

*Мы жывём, каб вяртацца*
*Час ад часу туды,*
*Дзе мінула юнацтва,*
*Дзе маленства сляды.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**15.** Якога слова не хапае на месцы пропуску ва ўстойлівым спалучэнні?

*За словам у … не лезе.*

**А)** кнігу. **Б)** сшытак. **В)** камп’ютар. **Г)** партфель. **Д)** кішэню.

---

**16.** Дадзены словы:

*1) падземны; 2) дзіцячы; 3) адзвінець;*
*4) дзінькаць; 5) дзікі.*

У якіх словах спалучэнне літар **дз** абазначае два гукі?

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**17.** Вызначце ў дадзеным прыкладзе слова-алагізм.

*Добры зрок маюць і птушкі, і жывёлы: арол, сокал, каршун, крот, сабака.*

**А)** арол. **Б)** сокал. **В)** каршун. **Г)** крот. **Д)** сабака.

---

**18.** Вызначце словы, напісаныя няправільна.

*1) арыентір; 2) камандыроўка; 3) мульціплікацыя; 4) медзіцына.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**19.** Словы *карыслівы – карысны* з’яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі.
**Г)** паронімамі. **Д)** гістарызмамі.

---

**20.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***ы***?

*1) гл..таць; 2) хр..бет; 3) р..дактар; 4) экз..мпляр.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**21.** Вызначце з дадзеных аднасастаўныя назыўныя сказы.

*1) У навальніцу раскалола стары клён.*
*2) Тым часам амаль развіднелася.*
*3) Халаднаваты туман над сцішаным лугам.*
*4) Верас на ўзлеску.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**22.** Якія знакі прыпынку паставіце ў сказе на месцы пропускаў?

*Якуб Колас нарадзіўся тут_ у гэтым маляўнічым лясным прыволлі_ дзе векавечныя хвоі падпіраюць сіняе неба_ а недалёка між зялёных берагоў струяцца хвалі нястомнага Нёмана (С. Александровіч).*

**А)** двукроп’е, дзве коскі. **Б)** тры коскі. **В)** коска, працяжнік, коска.
**Г)** двукроп’е, коска, працяжнік. **Д)** дзве коскі, кропка з коскай.

---

**23.** Якое слова з прапанаваных напісана няправільна?

*1) пастэраль; 2) тарэадор; 3) прэпрынт.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**24.** *Цёплае зашклёнае памяшканне для вырошчвання раслін* называецца … .

**А)** аранжарэя. **Б)** аранжырэя. **В)** арынжэрэя.
**Г)** аранжэрэя. **Д)** арэнжарэя.